Мясцовае самакіраванне

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

20 верасня 2017 г. №35 (419)

стар. 3

Як дажыць да 100 гадоў?

стар. 5

Добра там, дзе мы ёсць

стар. 8

Паляванне завяршылася... у ізалятары

ТЭМА ТЫДНЯ

ГОРАД У СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

Ці вырашаць аграгарадкі кадравую праблему ў аграпрамысловым комплексе?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЯКОЕ пытанне найбольш актуальнае для краіны, дзе вырабляюць высакаякасную сельскагаспадарчую прадукцыю, вядомую ва ўсім свеце? Насамрэч пытанняў заўсёды шмат — вырасціць прадукцыю, гарантаваць харчовую бяспеку, забяспечыць экспартныя пастаўкі...
Але не варта забываць, што за кожным цэнтнерам збожжа і літрам малака стаяць людзі, якія працуюць у сельскай мясцовасці. А каб ім працавалася добра, трэба стварыць умовы для работы і вольнага часу. У нашай краіне знайшлі выйсце — стварылі аграгарадкі.
Гэта беларускае ноу-хау — невялікі горад з развітой інфраструктурай непасрэдна на месцы вёскі.
Наколькі эфектыўная гэта ідэя і якія праблемы яна вырашыла, карэспандэнт МС паспрабаваў ацаніць разам з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу, намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Дзмітрыем ГОБАРАВЫМ.

стар. 4

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ЯК ПІЦЬ ДАЦЬ?

Чаму ў ашмянскіх калодзежах не хапае вады

Пітная вада ў Ашмянскім раёне — асаблівая. Гарадскія і вясковыя калодзежы «працуюць» у асноўным на паверхневых водах, якія не могуць пахваліцца добрым смакам. Вада мае бруднаваты колер і ўтрымлівае ў два разы больш жалеза, чым дапускаецца нормамі. Каб яна стала якаснай, неабходны станцыі абезжалезвання. Ашмянскія ўлады ўжо прапанавалі на ўзроўні рэспублікі ўнесці ў сацыяльныя стандарты абавязковае ўзвядзенне такіх станцый пры стварэнні аграгарадкоў з колькасцю жыхароў ад 1000 чалавек і больш.

Як «памыць» ваду

На водазаборы Вайгета, ад якога сілкуецца ўвесь горад, станцыя абезжалезвання працуе. Дзякуючы гэтаму ў Ашмянах водаправодная вада якасная. У аграгарадках, што забяспечваюцца вадой са станцый на водазаборах у Гальшанах і Граўжышках, з кранаў таксама цячэ якасны прадукт.

Іншая справа — сельская мясцовасць, дзе без станцый абезжалезвання палепшыць якасць вады можна толькі з дапамогай фільтраў. Аднак праз павышаную колькасць у вадзе жалеза іх трэба мяняць значна часцей, чым звычайна. Пакутуе і бытавая тэхніка, што кантактуе з вадой, — «рыжыя літры» значна скарачаюць тэрмін службы прыбораў.

— Асноўны ўпор на забеспячэнне якасці вады мы робім у аграгарадках. Станцыі абезжалезвання жыццёва неабходныя ў Навасёлках, станцыі Ашмяны, Кракоўцы. Сітуацыя ў апошняй непакоіць нас найбольш. Плануецца, што ў наступным годзе тут будзе пабудавана станцыя абезжалезвання (на гэта патрэбна прыкладна 200 тысяч рублёў). Ужо распрацаваны праект, — расказаў **Вадзім ПАШКОЎСКІ, намеснік старшыні Ашмянскага райвыканкама.** — На жаль, бюджэтных сродкаў райвыканкаму, як правіла, хапае толькі на замену камунікацый па адной вуліцы пасёлка, і мы стараемся мяняць іх менавіта ў аграгарадках, бо тут найбольш складаная сітуацыя.

Забруджванне вады на Ашмяншчыне адбываецца, па-першае, праз саму падземную крыніцу, у якой колькасць жалеза перавышае норму амаль у два разы: замест 0,3 мг/дм³ тутэйшы паказчык — 0,32—0,76, а колер вады — рыжы. Мясцовыя жыхары кажуць, што калі кран не закрыць шчыльна, то праз некалькі гадзін на ўмывальніку з'явяцца ржавыя палосы. Па-другое, вада дадаткова пагаршаецца, пакуль цячэ па старых трубах.

стар. 8